// НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА

21 ліпеня 2023 г.

# Слухайце інтуіцыю

Усям'і Дзмітрыя Бурака, вьшускніка аграмеханічнага факультэта БДАТУ, і бацька, і дзядулі маюць тзхнічную адукацыю. Натуральна, і Дзіма пасля 9 класа захацеу атрымаць тзхнічную прафесію. Побач з родным горадам Баранавічы быу Навамышскі дзяржауны аграрны каледж, дзе можна было набыць кваліфікацыю "аутаслесар-трактарыст-вадзіцель катэгоры "С". Слова "трактарыст" назве прафесіі юнак праігнаравау, але, як аказалася, дарма..

Прафесія трактарыста так захапіла, што ён далей пайшоу вучыцца на тзхніка-механіка у Лунінецкі дзяржауны прафесійна-тзхнічньї каледж сельскагаспадарчай вытворчасці, які скончыу у 2017 годзе. Балаў крыху не хапіла да дыплома з адзнакай, але затое удалося паудзельнічаць у беларускім WorldSkills і нават стаць пераможцам раённага конкурсу прафесійнага майстэрства.

У 2016 годзе Дзіма прыязджаў на конкурс "Аграмайстэрства" у Беларускі дзяржауны аграрны тзхнічньї універсітзт, дзе яму неверагодна спадабалася. Тут было усё і адразу: тэхнічная прафесія на аграмеханічньїм факультэце, сапраудныя трактары у вучэбных аудыторыях, выдатны інтзрнат. Пасля каледжа малады чалавек узяу мэтавае накіраванне, бо пасля вучобы хацеу вярнуцца дадому, і паступіу у БДАТУ.

Скончыушы універсітзт, Д.Бурак быу прызваны на тзрміновую ваенную службу. Яе ён праходзіу у Брэсцкай Чырванасцяжнай пагранічнай групе на тэрыторьп былой легендарней 9-й заставы. Пасля арміі Дзмітрый вярнууся дадому, як і планавау перад паступленнем ва універсітзт. Зараз працуе інжынерам па працаемкіх працэсах у ТАА "СталовічыАгра" Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Да таго ж Дзмітрый вучыцца у магістратуры БДАТУ на завочным аддзяленні па спецыяльнасці "Тзхнічнае забеспячэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі". Тэма яго магістарскай дысертацыі —"Узаемадзеянне рухавікоу машын з глебай і аналіз паказчыкау у сістзме". Дарэчы, у магістранта кафедры эксплуатацыі машынна-трактарнага парка і агратзх-налогій 14 надрукаваных работ і хутка яшчэ тры пабачаць свет.

На пытанне, што б ён параіў учарашнім школьнікам, Дзмітрый адказау так:

— Па-першае, выбіраць будучую прафесію, не арыентуючыся на моду, а абапіраючыся на уласнае разумение і інтуіцыю. Па-другое, памятаць, што студзнцтва — унікальньї час, і важна не растраціць яго дарма, а наадварот, набыць як мага больш ведау і уражанняу. Па-трэцяе, не баяцца спрабаваць нешта новае, заусёды рухацца наперад. Па-чацвёртае, вашы таварышы па групе — гэта першыя дарослыя сябры.

Па-пятае, жыць пад сонцам і дажджом з любоую да сваіх блізкіх і роднай зямлі!

**Таццяна НЯПАРКА,**
**Алена ПАДАШЭЎСКАЯ.**